**Рэкамендацыі па выкарыстанні ў адукацыйным працэсе вучэбнага дапаможніка «Беларуская мова» для 9 класа**

Да 2019/2020 навучальнага года выдадзены новы вучэбны дапаможнік «Беларуская мова» для 9 класа *(Валочка Г.М., Васюковіч Л.С., Зелянко В.У., Якуба С.М., Байкова С.І. Беларуская мова : вучэбны дапаможнік для 9 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. – Мінск : НІА, 2019)*.




Новы вучэбны дапаможнік падрыхтаваны ў адпаведнасці з кампетэнтнасным падыходам і накіраваны на рэалізацыю асноўных мэт моўнай адукацыі ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі:

- засваенне ведаў пра сістэму беларускай мовы на ўсіх яе ўзроўнях (фанетычным, лексічным, фразеалагічным, марфемным і словаўтваральным, марфалагічным, сінтаксічным), заканамернасцей і правіл функцыянавання моўных сродкаў у маўленні, нормаў беларускай літаратурнай мовы, фарміраванне ўменняў практычнага выкарыстання мовы ва ўсіх відах маўленчай дзейнасці;
- фарміраванне камунікатыўных уменняў на аснове авалодання маўленчай тэорыяй (тэкст, тыпы, стылі і жанры маўлення) і культурай маўлення, уменняў ствараць самастойныя вусныя і пісьмовыя выказванні розных тыпаў, стыляў і жанраў;
- усведамленне вучнямі мовы як феномена культуры, у якім знайшлі адбітак яе праяўленні, як сродку спасціжэння айчыннай і сусветнай культуры; выпрацоўка ўменняў карыстацца культуразнаўчымі звесткамі з мэтай забеспячэння паўнавартаснай камунікацыі.

Вучэбны матэрыял у дапаможніку падаецца з апорай на веды вучняў, атрыманыя імі ў V–VIII класах, і накіраваны на фарміраванне ў іх аналітычных і аналітыка-сінтэтычных уменняў і навыкаў, пазнавальных інтарэсаў, уменняў і навыкаў самастойнай працы з вучэбным тэкстам (рубрыкі «Успамінаем вывучанае», «Скарбы мовы», якія вызначаюць спосабы вучэбных дзеянняў і віды дзейнасці).

Прыклад задання з рубрыкі «Успамінаем вывучанае»:

**8.** Вусна дапоўніце сказы неабходнай інфармацыяй.

**Тэкст** — гэта выказванне, у якім сказы звязаны па ... і граматычна.

Тэматычнае адзінства, разгорнутасць, паслядоўнасць, звязнасць, завершанасць — гэта ... тэксту.

Сказы ў тэксце аб'яднаны тэмай і асноўнай ... .

**Тэма** — гэта тое, пра ... ... ў тэксце.

**Асноўная думка** — гэта тое ..., што выказаў аўтар у тэксце. Яна перадае адносіны аўтара да таго, што ён піша, яго ацэнку падзеям ці з'явам.

Тэма тэксту, як і яго асноўная думка, можа быць выказана ў загалоўку. Напрыклад, ...: «У лесе», «Канікулы на моры», «Зімой»; ... ...: «Кожная птушка і звер у лесе жывуць сваім жыццём», «Мае́ самыя цікавыя канікулы», «Зіма — прыгожая пара года».

Прыклад задання з рубрыкі «Скарбы мовы»:

**32.** Прачытайце з адпаведнай інтанацыяй творы вуснай народнай творчасці. Вызначце іх жанр. Адгадайце загадкі, растлумачце сэнс прыказак.

**1. Выходзь на поле з расою, дык будз..ш з ядою. 2. Ад л..ноты чакай б..доты. 3. Ч..рвонае цельца, каме..ае сэрца, прыемнае на смак, а завецца як? 4. За праўду стой гарой. 5. Хто л..ціць без крылаў? 6. Што без вады плавае? 7. Не чапай ліха, пакуль сядзіць ціха. 8. Хто ў ч..рвоных ботах ходзіць па балота..? 9. Не цані ч..лавека па твар.., а цані па душ.. .**

Абгрунтуйце пастаноўку знакаў прыпынку ў канцы сказаў. Што выражаецца ў загадках, прыказках?

Спішыце, устаўляючы прапушчаныя літары. Падкрэсліце дзеясловы, якія перадаюць пабуджэнне да дзеяння.

У вучэбным дапаможніку выкарыстоўваюцца разнастайныя спосабы для азнаямлення з новым матэрыялам і яго засваення: індуктыўны (ад назіранняў да вывадаў); дэдуктыўны (вывад пацвярджаецца наступнымі назіраннямі); аналітычны, які дазваляе фарміраваць у навучэнцаў уменні і навыкі знаходзіць патрэбную інфармацыю, аналізаваць і інтэрпрэтаваць яе, ацэньваць і выкарыстоўваць для вырашэння пастаўленай задачы.

Прапанаваны ў вучэбным дапаможніку практычны матэрыял з'яўляецца дастатковым для атрымання навучэнцамі адзнак, адпаведных усім узроўням засваення вучэбнага матэрыялу.

Матэрыял практыкаванняў новага вучэбнага дапаможніка накіраваны на рэалізацыю міжпрадметных сувязей, фарміраванне інтэлектуальнай, духоўнамаральнай, камунікатыўнай, грамадзянскай культуры вучняў.

Так, напрыклад, матэрыял практыкавання 94 скіраваны на фарміраванне грамадзянскай культуры вучняў.

**94.** Прачытайце тэкст, размяркоўваючы складаназлучаныя сказы чацвёртага абзаца ў адпаведнасці са схемамі. Вызначце колькасць частак у тэксце.

1. [Як ..., ____ ____ ], але [ ____ ____ ].
2. Ці [ ____ ____ ], ці [ ____ ____ ].
3. То [ ____ ____ ], то [ ____ ____ ].

**Кош смецця**

Паездку ў грыбы запланавалі яшчэ вечарам.

У лесе дождж накрапваў зусім рэдкі, і перашкодай для грыбнога палявання ён ніколечкі не быў. Але як ні стараўся Лёшка, як ні пераглядаў кожную травінку, нічога не знаходзіў.



Хлопец пайшоў далей. А найлепшыя памагатыя не толькі пільны зрок, але і добрыя ногі. Хацеў разагнацца, але позірк выхапіў нешта бялюткае каля старой бярозы. *Ці то белы гры.. прыхава..ся ці то сырае..ка лісіцікам прыкрылася.* Падышоў бліжэй і разгледзеў поліэтыленавы пакет, а побач з ім ляжала металічная бляшанка з-пад кансерваў. Лёшка загарнуў бляшанку ў пакет і паклаў у кошык. Не пакідаць жа смецце ў лесе.

Як на злосць, грыбы не трапляліся на вочы, але погляд спыніўся на нечым іншым. То пластмасавыя бутэлькі згрувашчаны ў кучы, то пластыкавыя стаканчыкі параскіданы. Ці чарговы пакет ляжыць ледзь не праз кожную сотню крокаў, ці металічная бляшанка валяецца.

Хлопец добра ведае, якую шкоду наносіць смецце навакольнаму асяроддзю. Ён і ў горадзе наладжвае суботнікі[сл]. Вось нядаўна палову дня ў нядзелю правёў у Севастопальскім парку. І бутэлькі збіраў, і шмат іншай драбязы да сметніц перанёс.

Калі хлопец вярнуўся да машыны, мама з дзядулем былі ўжо там з двума кошыкамі грыбоў. Яны ўсё зразумелі *(Паводле А. Карлюкевіча).*

Чаму хлопец збіраў смецце? Якая карысць ад збору смецця паасобку? Абгрунтуйце сваю думку.

Запішыце чацвёрты абзац тэксту, захоўваючы логіку размяшчэння сказаў. Назавіце сродкі сувязі граматычных частак складаназлучных сказаў і вызначце тып сэнсавых адносін паміж імі.

● Запішыце выдзелены сказ. Растлумачце напісанне арфаграм і пастаноўку знакаў прыпынку ў ім. Складзіце схему сказа.

Разгледзьце фотаздымак. Пры асвятленні якой тэмы яго можна выкарыстаць як ілюстрацыю?

У дапаможніку рэалізуецца навігацыйная функцыя: маюцца спасылкі на кампаненты вучэбна-метадычнага комплексу па вучэбным прадмеце (дадатковы матэрыял, размешчаны на электронным адукацыйным рэсурсе

«Беларуская мова. 9 клас» нацыянальнага адукацыйнага партала (http: // e vedy.adu.by/); заданні (QR-коды) для праверкі ведаў з дапамогай смартфона або планшэта):

**70.** Выканайце тэставыя заданні па тэме «Складаназлучаныя сказы: будова, значэнне, ужыванне».

**59.** Выканайце інтэрактыўнае заданне па тэме «Складаны сказ: будова, значэнне, ужыванне»: размяркуйце сказы па групах у залежнасці ад іх тыпу.

Спасылкі на электронны адукацыйны рэсурс у новым вучэбным дапаможніку дазволяць дыферэнцаваць і індывідуалізаваць адукацыйны працэс, арганізаваць работу з навучэнцамі з розным узроўнем адукацыйнай падрыхтоўкі і матывацыі да вывучэння беларускай мовы.

Вучэбны дапаможнік мае сістэму арыентацыі ў ім.

Выкарыстоўваюцца ўмоўныя абазначэнні для правядзення розных відаў разбору (фанетычнага$^{ф}$, лексічнага$^{л}$, сінтаксічнага$^{сн}$).

Знак «*» пасля слова паказвае на тлумачэнне значэння гэтага слова ў слоўніку ў канцы дапаможніка.

Спецыяльныя знакі-сімвалы паказваюць на наяўнасць заданняў з электроннага рэсурса; дадатковых пытанняў і заданняў, накіраваных на замацаванне ведаў і ўменняў па раней вывучаных раздзелах і тэмах; заданняў, накіраваных на ўзбагачэнне слоўнікавага запасу вучняў; заданняў творчага характару, накіраваных на развіццё звязнага маўлення вучняў:

— заданні, накіраваныя на ўзбагачэнне слоўнікавага запасу вучняў;

— дадатковыя пытанні і заданні, накіраваныя на замацаванне ведаў і ўменняў па раней вывучаных тэмах;

— заданні творчага характару, накіраваныя на развіццё звязнага маўлення вучняў;

— дадатковы матэрыял, размешчаны на электронным адукацыйным рэсурсе «Беларуская мова. 9 клас» (нацыянальны адукацыйны партал: http://e-vedy.adu.by);

— спасылкі на заданні (QR-коды) для праверкі ведаў пры дапамозе смартфона ці планшэта.

Вучэбны матэрыял групуецца па раздзелах з улікам асноўных зместавых ліній, якія складаюць аснову вучэбнага прадмета «Беларуская мова» ў 9 класе: «Стылі маўлення», «Тэкст», «Складаны сказ: будова, значэнне, ужыванне», «Складаназлучаныя сказы: будова, значэнне, ужыванне», «Складаназалежныя сказы: будова, значэнне, ужыванне», «Бяззлучнікавыя складаныя сказы: будова, значэнне, ужыванне», «Складаныя сказы з рознымі відамі сувязі частак: будова, значэнне, ужыванне», «Сінтаксічныя канструкцыі з чужой мовай: будова, значэнне, ужыванне».

Асноўнымі структурнымі часткамі вучэбнага дапаможніка «Беларуская мова. 9 клас» з'яўляюцца тэкставы і пазатэкставы кампаненты.

*Тэкставы кампанент* уключае:

а) асноўную частку: тэарэтычны (правілы) і практычны (практыкаванні) матэрыял;

б) дадатковую частку:

– лінгвістычную інфармацыю, прыведзеную ў спецыяльных рубрыках;
– тлумачальны слоўнік, у якім раскрываюцца значэнні слоў, пазначаных зорачкамі (*);
– руска-беларускі слоўнік, змешчаны пасля тэкстаў для перакладу; – алгарытмы моўных разбораў. *Пазатэкставы кампанент* складаецца з:

а) апарату арганізацыі засваення (пытанні, заданні, гіперспасылкі на электронныя адукацыйныя рэсурсы на базе платформы Moodle: http://evedy.adu.by);

б) ілюстрацыйнага матэрыялу (малюнкі, схемы, табліцы);

в) апарату арыенціроўкі (змест, сімвалічныя абазначэнні).

Вучэбны дапаможнік складаецца з раздзелаў і параграфаў, назвы якіх адпавядаюць зместу вучэбнага прадмета «Беларуская мова», вызначанаму вучэбнай праграмай (9 клас). У вучэбным дапаможніку знаходзяць адлюстраванне ўказаныя ў вучэбнай праграме віды дзейнасці.

У канцы кожнага раздзела прадугледжваецца падагульненне і сістэматызацыя вывучанага матэрыялу шляхам выкарыстання падагульняльных пытанняў і заданняў, вылучэння асноўных палажэнняў, складання падагульняльных табліц, схем, алгарытмаў і да т.п.

Напрыклад, у канцы раздзела «Складаны сказ: будова, значэнне, ужыванне» змешчаны наступныя кантрольныя пытанні і заданні:

**КАНТРОЛЬНЫЯ ПЫТАННІ І ЗАДАННІ**

1. Які сказ называецца складаным? Прывядзіце прыклады складаных сказаў.
2. Якую ролю адыгрываюць інтанацыя, злучнікі і злучальныя словы ў складаных сказах? Абгрунтуйце сваю думку.
3. Назавіце віды сувязі, што існуюць паміж часткамі складанага сказа. Якія сказы называюцца злучнікавымі, а якія — бяззлучнікавымі? Прывядзіце прыклады такіх сказаў.
4. Раскажыце пра складаныя сказы з рознымі відамі сувязі частак.

Сістэма практыкаванняў, накіраваных на засваенне вучэбнага матэрыялу, прадугледжвае паступовае ўскладненне заданняў: ад *прапедэўтычных практыкаванняў* (узнаўленне вывучанага матэрыялу, выкананне падрыхтоўчых заданняў) да *практыкаванняў-ілюстрацый* (аналіз прапанаванага дыдактычнага матэрыялу: слоў, словазлучэнняў, сказаў, тэкстаў), *замацавальных практыкаванняў* (тлумачэнне арфаграм і пунктаграм, падбор уласных прыкладаў), *творчых практыкаванняў* (складанне словазлучэнняў і сказаў, пераканструяванне прыкладаў, выкарыстанне моўных адзінак у творчых работах).

Так, да тэмы «Складаназалежныя сказы з даданай азначальнай часткай (сродкі сувязі, знакі прыпынку)» прапанавана наступная сістэма практыкаванняў (практ. 111–115).

**111.** Вусна адкажыце на пытанні.

Які член сказа называецца азначэннем?
На якія пытанні адказвае азначэнне?
Якімі часцінамі мовы звычайна выражаюцца азначэнні? Прывядзіце прыклады.

Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку ў сказах:

| | |
|---|---|
| Паўлік выскачыў з хаты з акрайчыкам цёплага яшчэ хлеба, шчодра пасыпанага буйной соллю *(В. Кадзетава)*. | Паўлік выскачыў з хаты з акрайчыкам цёплага яшчэ хлеба, які быў шчодра пасыпаны буйной соллю. |

**112.** Прачытайце складаназалежныя сказы. Назавіце ў іх галоўную і дададную часткі. Укажыце ў галоўнай частцы слова (спалучэнне слоў), якое паясняе дададная частка. Пастаўце пытанне ад галоўнай часткі да дададнай. Вызначце сродкі сінтаксічнай сувязі частак.

**113.** Перабудуйце простыя сказы з адасобленымі азначэннямі ў складаназалежныя сказы з дададнымі азначальнымі часткамі. Запішыце, пабудуйце схемы сказаў.

**114.** Прачытайце тэкст. Дайце яму загаловак, які перадаваў бы тэму тэксту.

Падбярыце сінонімы да слова *валюхалася*. У якіх стылях маўлення дапускаецца яго ўжыванне?
Дайце імя герою апавядання і запішыце тэкст ад трэцяй асобы. Устаўце, дзе трэба, прапушчаныя літары, раскрыйце дужкі, пастаўце знакі прыпынку.
Пазначце лічбамі складаназалежныя сказы з дададнымі азначальнымі часткамі, пабудуйце іх схемы.

**115.** Прачытайце тэкст. Вызначце від сувязі сказаў у тэксце.
Выпішыце з тэксту складаназалежныя сказы з дададнымі азначальнымі часткамі. Пабудуйце іх схемы.

Чаму збан без ручкі ў беларускай мове называецца *гладыш*?

Выкарыстанне ў якасці дыдактычнага матэрыялу тэкстаў – урыўкаў з твораў мастацкай літаратуры – спрыяе стварэнню на вучэбных занятках развіццёвага маўленчага асяроддзя: рашэнне моўных і маўленчых задач на аснове тэксту стварае ўмовы для фарміравання ў вучняў правільнасці маўлення (авалодання моўнымі і маўленчымі нормамі) і камунікатыўнай мэтазгоднасці маўлення (развіцця і ўдасканалення такіх камунікатыўных якасцей маўлення, як дакладнасць, лагічнасць, чысціня, багацце, выразнасць, дарэчнасць).

Заданні да тэкстаў скіраваны не толькі на выпрацоўку вучэбна-моўных уменняў і навыкаў вучняў (фанетычных, арфаграфічных, лексічных і інш.), але і на фарміраванне *чытацкай пісьменнасці* – здольнасці разумець і выкарыстоўваць пісьмовыя тэксты, разважаць пра іх і займацца чытаннем для рэалізацыі сваіх мэт, пашыраць свае веды і магчымасці, удзельнічаць у сацыяльным жыцці (згодна з міжнароднымі даследаваннямі PISA). Такія заданні патрабуюць:

- знайсці і выбраць інфармацыю;
- інтэграваць і інтэрпрэтаваць паведамленне тэксту; - асэнсаваць і ацаніць змест або форму тэксту.

Першыя два ўменні падразумяваюць апору на тэкст, трэцяе патрабуе апоры на пазатэкставыя веды:

**53.** Прачытайце. Вызначце стыль і тып тэксту. Абгрунтуйце сваю думку, карыстаючыся кампазіцыйнай схемай разважання.

**Сусветная памяць ЮНЕСКА**

Вы, напэўна, бывалі ў Мірскім замку, а мо і ў **Нясвіжскім.** Магчыма, хадзілі па таемных сцежках **Белавежскай** пушчы, наведвалі Дугу Струвэ. А ці ведаеце вы, што гэтыя аб'екты належаць не толькі да нашага **нацыянальнага** багацця, а і да агульнаеўрапейскіх чалавечых каштоўнасцей і набыткаў?

Паводле рашэння ЮНЕСКА, Мірскі і Нясвіжскі замкі, Белавежская пушча, Дуга Струвэ ўключаны ў Спіс сусветнай культурнай **спадчыны.** А гэта азначае, што нашы нацыянальныя скарбы становяцца на адзін узровень з Егіпецкімі пірамідамі, Вялікай Кітайскай сцяной і іншымі сусветнымі **шэдэўрамі.**

Афіцыйнымі мовамі ЮНЕСКА з'яўляюцца англійская, арабская, іспанская, кітайская, руская і французская, аднак арганізацыя вітае развіццё і захаванне іншых нацыянальных моў. Асаблівая ўвага надаецца і беларускай мове. Вывучаючы нашу мову, размаўляючы па-беларуску, вы тым самым дапамагаеце ажыццяўляць карысную дзейнасць ЮНЕСКА, што спрыяе захаванню культурнай і моўнай разнастайнасці.

Знайдзіце свой шлях удзелу ў праграмах ЮНЕСКА, каб садзейнічаць захаванню беларускай і сусветнай культурнай спадчыны *(Паводле А. Бутэвіча).*




Якая тэма ўзнята аўтарам у тэксце? Каму ён адрасаваны?
Што вы ведаеце пра дзейнасць ЮНЕСКА?
Спішыце другі абзац. Падкрэсліце граматычныя асновы ў складаным сказе.
- Растлумачце арфаграмы ў выдзеленых словах.
- Вызначце род назоўніка ЮНЕСКА.

Падзяліце тэкст на часткі. Складзіце яго план.
Разгледзьце малюнак. Што на ім адлюстравана? Раскажыце пра беларускія шэдэўры культуры, занесеныя ЮНЕСКА ў Спіс сусветнай культурнай спадчыны.

Моўную аснову асобных практыкаванняў складаюць фразеалагізмы, прыказкі, прымаўкі (рубрыка «Скарбы мовы»), што спрыяе ўзмацненню семантычнага аспекту пры навучанні беларускай мове, а таксама засваенню вучнямі «закадзіраваных» у фраземах і парэміях звестак пра гісторыю, духоўнае жыццё, этнічны побыт, характар беларускага народа.

Вучэбны дапаможнік па беларускай мове для 9 класа разлічаны на творчае выкарыстанне настаўнікамі.